ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 10 (249) | Субота, 26 сакавіка 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## У К А З
## Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР

### Аб узнагароджанні Прафесіянальных Саюзаў СССР ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

За вялікія заслугі ў рэвалюцыйным руху і Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у вырашэнні задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных узнагародзіць **Прафесіянальныя Саюзы СССР** ордэнам **Кастрычніцкай Рэвалюцыі.**

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР**
**М. ПАДГОРНЫ.**
**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР**
**М. ГЕАРГАДЗЕ.**

Масква, Крэмль. 18 сакавіка 1977 г.

# XVI З'ЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ СССР

МАСКВА. (ТАСС). 21 сакавіка ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў пачаў работу XVI з'езд прафсаюзаў СССР — самай масавай грамадскай арганізацыі,якая налічвае ў сваіх радах больш чым 113 мільёнаў чалавек.

У прывітанні Цэнтральнага Камітэта КПСС з'езду прафсаюзаў адзначаецца, што партыя высока цэніць дзейнасць савецкіх прафсаюзаў, іх уклад у справу камуністычнага будаўніцтва. ЦК КПСС пажадаў дэлегатам вялікіх поспехаў у рабоце і выказаў цвёрдую ўпэўненасць у тым, што прафесіянальныя саюзы прыкладуць усе намаганні для паспяховага выканання велічных задач, пастаўленых XXV з'ездам КПСС. У зале Палаца з'ездаў — больш чым 5 тысяч дэлегатаў — пасланцоў рабочага класа, калгаснага сялянства, народнай інтэлігенцыі. Прысутнічаюць шматлікія зарубежныя госці — дэлегацыі прафсаюзаў брацкіх сацыялістычных краін, прадстаўнікі прафсаюзаў капіталістычных дзяржаў і краін, якія сталі на шлях развіцця, Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў і іншых міжнародных арганізацый.

Бурнымі, доўга не змаўкаючымі апладысментамі сустрэлі прысутныя таварышаў **Л. І. Брэжнева, Ю. У. Андропава, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, А. П. Кірыленку, А. М. Касыгіна, Ф. Д. Кулакова, Д. Ф. Усцінава, П. М. Дземічава, Б. М. Панамарова, М. С. Саломенцава, І. В. Капітонава, У. І. Далгіх, К. Ф. Катушава, М. В. Зімяніна, К. У. Чарненку, Я. П. Рабава.**

Аднадушна быў выбран ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС на чале з Генеральным сакратаром ЦК КПСС таварышам Л. І. Брэжневым.

Пасля выбрання кіруючых органаў з'езда зацвярджаецца парадак дня:

справаздача Усесаюзнага Цэнтральнага Савета Прафесіянальных Саюзаў;

справаздача цэнтральнай рэвізійнай камісіі;

выбары Усесаюзнага Цэнтральнага Савета Прафесіянальных Саюзаў і цэнтральнай рэвізійнай камісіі.

Бурнай, доўга не змаўкаючай авацыяй сустрэлі дэлегаты і госці Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева, які выступіў з прамовай.

У заключэнне сваёй прамовы таварыш Л. І. Брэжнеў зачытаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні прафесіянальных саюзаў СССР ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі — за вялікія заслугі ў рэвалюцыйным руху і Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у вырашэнні задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, актыўны ўдзел у камуністычным выхаванні працоўных. Таварыш Л. І. Брэжнеў прымацаваў ордэн да сцяга ВЦСПС.

Генеральны сакратар ЦК КПСС перадаў прэзідыуму з'езда прывітанне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза XVI з'езду прафесіянальных саюзаў СССР.

Ад імя дэлегатаў з'езда, ад імя ўсіх членаў савецкіх прафсаюзаў старшыня ВЦСПС А. І. Шыбаеў горача падзякаваў Цэнтральнаму Камітэту КПСС, яго Палітбюро, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР, асабіста таварышаў Леаніду Ільічу Брэжневу за высокую ацэнку работы прафесіянальных саюзаў.

Затым з'езд пачаў абмеркаванне першага пункта парадку дня. Са справаздачай аб рабоце ВЦСПС і задачах прафесіянальных саюзаў СССР у святле рашэнняў XXV з'езда КПСС выступіў старшыня ВЦСПС А. І. Шыбаеў.

* * *

МАСКВА. (ТАСС). У Крамлёўскім Палацы з'ездаў 22 сакавіка прадоўжыў работу XVI з'езд савецкіх прафсаюзаў. Пасля справаздачных дакладаў ВЦСПС і Цэнтральнай рэвізійнай камісіі пачаліся спрэчкі.

Дэлегаты і госці знаходзяцца пад велізарным уражаннем ад прамовы, з якой выступіў у дзень адкрыцця з'езда Генеральны сакратар ЦК КПСС таврыш Л. І. Брэжнеў. У гэтай прамове глыбока раскрыта роля прафсаюзаў у жыцці савецкай краіны, вызначаны іх задачы ў сучасных умовах.

Выступаючыя на з'ездзе прафсаюзныя работнікі, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў, перадавікі вытворчасці заяўляюць, што ў адказ на заклік партыі савецкія людзі будуць яшчэ з большай настойлівасцю рабіць усё неабходнае для таго, каб уклад прафсаюзаў у вырашэнне задач, пастаўленых XXV з'ездам партыі, станавіўся яшчэ больш важкім. Прамоўцы падкрэсліваюць ролю прафсаюзаў у арганізацыі спаборніцтва, у пашырэнні вопыту наватараў. Выступаючыя падкрэсліваюць таксама узрастаючае значэнне сустрэчных планаў працоўных калектываў для росту эфектыўнасці вытворчасці.

Важным інструментам далейшага павышэння ўзроўню жыцця народа з'яўляюцца планы сацыяльнага развіцця, якія дзейнічаюць цяпер на тысячах прадпрыемстваў, у многіх гарадах і раёнах краіны. Прафсаюзным арганізацыям, указваецца на з'ездзе, неабходна і ў далейшым удасканальваць практыку сацыяльнага планавання. Значнае месца ў выступленнях удзяляецца актывізацыі работы ўсіх звенняў прафсаюзаў, павышэнню баявітасці прафсаюзных арганізацый.

Дэлегаты з'езда з гордасцю гавораць аб тым, што толькі ва ўмовах сацыялізму прафсаюзы валодаюць сапраўды дэмакратычнымі паўнамоцтвамі. Савецкія працоўныя на справе карыстаюцца ўсёй паўнатой правоў чалавека — свабодай слова, правам на працу, адпачынак, сацыяльнае забеспячэнне, якіх пазбаўлены людзі працы ў краінах капіталу.

* * *

23—25 сакавіка XVI з'езд прафсаюзаў СССР працягваў сваю работу.

# УНІВЕРСІТЭТ НАВЕДАЛІ КІРУЮЧЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ РАБОТНІКІ



Работа вышэйшай школы нашай краіны на ўсім шляху яе развіцця стаіць у цэнтры ўвагі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада. Асабліва адказныя задачы, вынікаючыя з рашэнняў XXV з'езда КПСС, належыць вырашыць вучоным і навуковым супрацоўнікам на цяперашнім этапе камуністычнага будаўніцтва. Неабходна пастаянна ўдасканальваць вучэбна-выхаваўчы працэс і павышаць якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, максімальна наблізіць навуку да практычнага жыцця, сканцэнтроўваць сілы для распрацоўкі важнейшых у народнай гаспадарцы праблем і эфектыўна ўкараняць іх вынікі ў вытворчасць.

Іменна вырашэнне гэтых пытанняў цікавіла першага сакратара Гомельскага абкома КПБ В. А. Гвоздзева, сакратара абкома КПБ С. П. Бабыра, загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў абкома КПБ Ф. Р. Забродскага, сакратара гаркома КПБ Н. Ф. Іванову, якія днямі наведалі наш універсітэт. Кіруючыя партыйныя работнікі вобласці і горада падрабязна азнаёміліся з пастаноўкай работы на факультэтах і кафедрах, з праблемамі, над якімі працуюць навуковыя падраздзяленні.

У рэктарацы і ў ходзе азнаямлення з работай універсітэта ішла размова аб тых праблемах, якія стаяць перад народнай гаспадаркай вобласці ў дзесятай пяцігодцы і які ўклад у іх паспяховае вырашэнне могуць унесці вучоныя і навуковыя супрацоўнікі ГДУ. Абмеркаваны таксама пытанні неабходнай для ўніверсітэта дапамогі ў справе яго далейшага станаўлення, пашырэння і паглыблення навуковых распрацовак.

**На здымку:** у адной з лабараторый фізічнага факультэта. Азнаямленне з падрыхтоўкай спецыялістаў па індывідуальнаму плану, на які фізічны факультэт ГДУ перайшоў першым у нашай рэспубліцы.

Фота **А. Карніенкі.**

**Рэктару Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта**
**тав. БОКУЦЮ Б. В.**
**Сакратару парткома**
**тав. КАЗЛОВУ У. В.**

Выказваем шчырую падзяку за цёплы, сардэчны прыём групы беларускіх пісьменнікаў у часе Дзён беларускай літаратуры на Гомельшчыне, прысвечаных 60-й гадавіне Вялікага Кастрычніка, за дадзеную магчымасць выступіць перад студэнтамі і выкладчыкамі Вашага ўніверсітэта.

Мы ўпэўнены, што сувязі паміж пісьменнікамі і студэнтамі застануцца і надалей такімі ж трывалымі і шчырымі, што будзе спрыяць лепшаму ідэйнаму і эстэтычнаму выхаванню савецкай моладзі.

**З глыбокай павагай**
**Першы сакратар Праўлення СП БССР Іван ШАМЯКІН.**

КАРЫСНАЕ ПАЧЫНАННЕ

# ДЛЯ ПАЛЯПШЭННЯ ВЕДАЎ

Механіка-матэматычны факультэт па выніках зімовай сесіі значна здаў свае пазіцыі. Такая акалічнасць патрабуе паляпшэння, удасканальвання вучэбнага працэсу, пошукаў новых форм работы. Актыўна працуюць у гэтым напрамку выкладчыкі і супрацоўнікі кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў. Так, напрыклад, выкладчык У. Р. Ермакоў прапанаваў новую форму правядзення калёквіума па дыфураўненнях — калёквіум у выглядзе алімпіяды паміж групамі.

Днямі цікавая ідэя атрымала сваё рэальнае ўвасабленне. Студэнты групы М-24 выклікалі на спаборніцтва групу М-26.

Пасля першага этапа, у час якога прадстаўнікі каманд рашалі задачы, прапанаваныя загадчыкам кафедры дыфураўненняў кандыдатам фізіка-матэматычных навук У. І. Міроненкам, наперад выйшла група М-26. Паступова яна замацавала сваю перавагу і перамагла з агульным лікам 28:24,5.

Як жа ацэньваюць алімпіяду самі яе ўдзельнікі?

**Юрый Малееў**, студэнт групы М-26: Гэта алімпіяда значна адрознівалася ад усіх калёквіумаў, якія нам даводзілася здаваць раней. Яна была цікавай па форме і змястоўнай. Асабліва захапляльным было спаборніцтва капітанаў. Прадстаўнікі нашай каманды А. Скляны і Я. Барабанаў змаглі ва ўпартай барацьбе абыйсці сваіх супернікаў з групы М-24 І. Хамічкова і М. Пярцоўскага.

**А. Ягошына**, камсорг групы М-24: Алімпіяда спадабалася ўсім — і нам, і нашым сябрам-сапернікам. І нічога страшнага няма ў тым, што наша група прайграла, у сапраўднасці выйгралі ўсе ўдзельнікі. Нашы веды па дыфураўненнях значна палепшыліся.

**С. БАДРУНОЎ,**
**студэнт групы М-25.**

# НА СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

Пазаўчора адбылося сумеснае пасяджэнне Вучонага савета і партыйнага камітэта ўніверсітэта. Заслухана пытанне аб уздзеянні гаспадарча-дагаворнай работы на якасць вучэбнага працэсу на кафедрах радыёфізікі, заалогіі і дарвінізму. З паведамленнямі выступілі загадчыкі гэтых кафедр дацэнт І. Ф. Дабравольскі і прафесар Б. П. Савіцкі.

Вучоны савет абраў конкурсную камісію па замяшчэнню пасад прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Па конкурсу абраны на вакантныя і перавыбраны на займаемыя пасады прафесарска-выкладчыцкі састаў.

# МЕРАПРЫЕМСТВЫ ГДУ

## ПА ДАСТОЙНАЙ СУСТРЭЧЫ 60-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

1. Арганізаваць глыбокае вывучэнне прафесарска-выкладчыцкім саставам, усімі студэнтамі і супрацоўнікамі ўніверсітэта пастановы КПСС ад 31 студзеня 1977 года «Аб 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». У гэтых мэтах шырока выкарыстоўваць філіял вячэрняга ўніверсітэта марксізму-ленінізму, тэарэтычныя семінары і школы сістэмы палітычнай асветы, палітзанякі сярод супрацоўнікаў універсітэта і ў студэнцкіх групах, вучэбны працэс, і перш за ўсё, вывучэнне грамадскіх дысцыплін.

**(На працягу года, адказн. — партком, рэктарат, камітэт камсамола, вучэбная частка, дэканаты, кафедры).**

2. Абмеркаваць пастанову ва ўсіх пярвічных партыйных арганізацыях і распрацаваць мерапрыемствы па яе рэалізацыі.

**(Сакавік 1977 г., адказн. — партыйныя бюро падраздзяленняў універсітэта, партгрупоргі).**

3. Правесці тэарэтычныя канферэнцыі, прысвечаныя 60-й гадавіне Кастрычніка, сярод выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта.

**(Кастрычнік 1977 г., адказн. — партком, рэктарат, камітэт ЛКСМБ, кафедры грамадскіх навук).**

4. Арганізаваць сумесна з аблана і інстытутам удасканальвання настаўнікаў навукова-практычную канферэнцыю, прысвечаную развіццю народнай асветы ў СССР за 60 гадоў Савецкай улады.

**(Кастрычнік 1977 г., адказн. — кафедра педагогікі і псіхалогіі).**

5. Разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва па дастойнай сустрэчы юбілею і падвесці яго вынікі напярэдадні 60-годдзя Кастрычніка.

**(Адказн. — мясцком, прафком).**

6. Шырока выкарыстоўваць юбілейную тэматыку пры напісанні студэнтамі рэфератаў па ВДРС і выкананні навуковых работ для VII Усесаюзнага конкурсу, прысвечанага 60-годдзю Вялікага Кастрычніка і ВЛКСМ.

**(На працягу года, адказн. — кафедры грамадскіх навук, камітэт ЛКСМБ).**

7. У адпаведнасці з пастановай ЦК КПБ і СМ БССР ад 3 снежня 1976 г. № 353 і загадам Мінвуза БССР № 02 ад 4 студзеня 1977 года ажыццявіць пераход на праграмна-мэтавы метад планавання навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ.

**(Сакавік—кастрычнік 1977 г., адказн.— рэктарат, партком, дэканаты, кафедры).**

8. З мэтай павышэння навуковай і народнагаспадарчай значнасці выконваемай універсітэтам тэматыкі, паляпшэння арганізацыі навукова-даследчых работ і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў прааналізаваць дзейнасць факультэтаў і кафедр у напрамку павышэння якасці даследаванняў і іх эфектыўнасці, паляпшэння патэнтна-ліцэнзійнай і інфармацыйнай работы, умацавання сувязей з навуковымі ўстановамі Акадэміі навук СССР і БССР, прамысловымі і сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі і іншымі арганізацыямі, паляпшэння падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў.

9. Наладзіць работу галіновай лабараторыі «Электрадынаміка складаных сістэм».

**(Лістапад 1977 г., адказн. — навуковы аддзел, кафедра радыёфізікі).**

10. Адкрыць на грамадскіх пачатках пры кафедры палітычнай эканоміі лабараторыю сацыяльна-эканамічных праблем.

**(Лістапад 1977 г., адказн. — рэктарат, навуковы аддзел, кафедра палітычнай эканоміі).**

11. Закончыць падрыхтоўчую работу па стварэнню галіновай лабараторыі «Арганізацыйныя сістэмы кіравання прадпрыемствамі і аб'яднаннем» пры эканамічным факультэце на кафедрах галіновых эканомік і эканомікі працы.

**(Сакавік—кастрычнік, адказн.—рэктарат, навуковы аддзел, эканамічны факультэт).**

12. Выканаць 85 працэнтаў гадавога плана гаспдагаворных навукова-даследчых работ да 7 лістапада.

**(Адказн. — навуковы аддзел, кафедры, лабараторыі).**

13. Завяршыць укараненне ў вытворчасць чатырох закончаных распрацовак па кафедрах: эканомікі працы; фізіялогіі чалавека і жывёл; оптыкі.

**(Да лістапада 1977 г., адказн. — навуковы аддзел, кафедры).**

14. Прыняць актыўны ўдзел у аглядзе-конкурсе на лепшую навукова-даследчую і доследна-канструктарскую работу, укаранёную ў вытворчасць на прамысловых прадпрыемствах г. Гомеля ў 1976—1977 гг.

**(Адказн. — навуковы аддзел, Савет НТТ, кафедры).**

15. Арганізаваць і правесці агульнагарадскую выстаўку навукова-тэхнічнай творчасці моладзі (Гомель — НТТМ—77 г.), прысвечаную 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

**(Лістапад 1977 г., адказн. — навуковы аддзел, Савет НТТ, Савет маладых вучоных, камітэт ЛКСМБ, факультэты, кафедры).**

16. Правесці ўніверсітэцкі агляд-конкурс студэнцкіх навуковых работ, прысвечаны 60-годдзю Вялікага Кастрычніка, на якім адабраць для прадстаўлення на рэспубліканскі і Усесаюзны агляды-конкурсы не менш 270 работ па прыродазнаўчых навуках.

**(Лістапад 1977 г., адказн. — навуковы аддзел, камітэт ЛКСМБ, Савет па НДРС, кафедры грамадскіх навук).**

17. Арганізаваць і правесці летнюю школу юных матэматыкаў і фізікаў.

**(Ліпень—жнівень 1977 г., адказн. — Савет маладых вучоных, камітэт ЛКСМБ).**

18. У адпаведнасці з планам Мінвуза БССР правесці на высокім узроўні рэспубліканскі семінар па пытаннях удасканальвання навукова-даследчай работы і падрыхтоўкі навукова-педагагічных кадраў.

**(Адказн. — рэктарат, партком, навуковы аддзел).**

19. Распрацаваць тэматыку лекцый, прысвечаную 60-годдзю Кастрычніка, і арганізаваць чытанне цыклаў лекцый выкладчыкамі і лектарскай групай школы маладога лектара ў калектыве ГДУ, сярод насельніцтва г. Гомеля і вобласці. Правесці «Дні навукі» па гэтай тэматыцы ў раёнах вобласці, на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах.

**(Адказн. — партком, кафедры, пярвічная арганізацыя таварыства «Веды»).**

20. Афарміць наглядную агітацыю ў вучэбных карпусах і інтэрнатах ГДУ. Падрыхтаваць выстаўку «СССР за 60 гадоў Савецкай улады».

**(Да чэрвеня 1977 г., адказн. — дэканаты, кафедры грамадскіх навук, камітэт ЛКСМБ, прафком).**

21. Правесці кастрычніцкія канферэнцыі чытачоў, арганізаваць прагляд студэнтамі і выкладчыкамі спектакляў па гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыцы «Меч і крыж», «Парад» і інш., кінафільмаў ва ўніверсітэцкім кіналекторыі; падрыхтаваць выстаўку кніг «60 гадоў Савецкай улады».

**(На працягу года, адказн. — прафком, бібліятэка, клуб мастацкай самадзейнасці).**

22. Арганізаваць «Штаб выхаднога дня», «Клуб палітычнай інфармацыі», правесці ў вучэбных групах і ў інтэрнатах сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі, вайны і працы, гутаркі «За круглым сталом», прысвечаныя дасягненням Савецкай краіны за 60 гадоў.

**(Сакавік 1977 г., адказн.—партком, камітэт ЛКСМБ, прафком, камітэт ДТСААФ, кафедры грамадскіх навук, савет ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны).**

23. Правесці ленінскі суботнік, прысвечаны 107-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 60-й гадавіне Кастрычніка.

**(16 красавіка 1977 г., адказн. — партком, мясцком, прафком, камітэт ЛКСМБ).**

24. Арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва СБА пад дэвізам «60-годдзю Кастрычніка — 60 дзённых норм».

**(Сакавік — верасень 1977 г., адказн. камітэт ЛКСМБ).**

25. Правесці агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці факультэтаў, прысвечаны 60-годдзю Савецкай улады.

**(Сакавік 1977 г., адказн. — камітэт камсамола, клуб мастацкай самадзейнасці, прафком).**

26. Арганізаваць на факультэтах зорныя паходы па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы.

**(Люты — верасень 1977 г., адказн. — спортклуб, камітэт ЛКСМБ).**

27. У газеце «Гомельскі ўніверсітэт» шырока асвятляць работу па падрыхтоўцы да святкавання юбілею Вялікага Кастрычніка.

**(На працягу года, адказн. — рэдакцыя шматтыражнай газеты «Гомельскі ўніверсітэт»).**

28. Выступіць з артыкуламі па тэматыцы 60-годдзя Кастрычніка ў абласной газеце.

**(На працягу года, адказн. — кафедры грамадскіх навук).**



## ЗАПРАШАЕ ДЛЯ МНОГІХ ГАЛІН ГАСПАДАРКІ

У АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ грандыёзнай праграмы камуністычнага будаўніцтва, наметчанай XXV з'ездам КПСС, рэзка ўзрастаюць патрабаванні да падрыхтоўкі ў ВНУ маладых спецыялістаў для ўсіх галін народнай гаспадаркі. Гэтыя патрабаванні, сфармуляваныя ў Справаздачным дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева XXV з'езду КПСС, сталі арыенцірам у рабоце па ўдасканальванню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў на нашым факультэце.

Эканамічны факультэт як самастойная структурная адзінка ГДУ быў створан у лістападзе 1970 года. З'яўляючыся самым маладым ва ўніверсітэце, ён стаў і самым буйным па колькасці студэнтаў. Зараз на стацыянары займаецца 919 студэнтаў, на вячэрнім аддзяленні — 97, вядзецца падрыхтоўка будучых эканамістаў на завочным факультэце, дзе займаюцца 754 студэнты.

**На факультэце прадстаўлены дзве спецыяльнасці: 1704 «Эканоміка працы» і 1738 «Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі».**

**Уступныя экзамены абітурыенты спецыяльнасці АМАЭІ здаюць па матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна), спецыяльнасці «Эканоміка працы» — матэматыцы, гісторыі СССР і геаграфіі. Паступаючыя на абедзве спецыяльнасці пішуць таксама сачыненне па рускай або беларускай літаратуры.**

За час навучання студэнты нашага факультэта вывучаюць грамадскія, агульнанавуковыя, агульнаэканамічныя і спецыяльныя дысцыпліны.

Студэнты праходзяць практыку на буйнейшых прамысловых прадпрыемствах, у навукова-даследчых інстытутах і вылічальных цэнтрах Беларусі і краіны: Беларускім філіяле НДІ працы ў Мінску, на Волжскім аўтамабільным заводзе імя 50-годдзя СССР у г. Тальяці, у вылічальных цэнтрах Масквы, Адэсы і інш.

Па заканчэнню ўніверсітэта выпускнікі спецыяльнасці эканомікі працы атрымліваюць кваліфікацыю «эканаміст», а АМАЭІ —«інжынер-эканаміст».

Паспяхова працуюць нашы выпускнікі на прадпрыемствах, ва ўстановах розных гарадоў краіны. Так, В. Каротчыкаў — загадчык прамыслова-транспартнага аддзела Светлагорскага ГК КПБ, В. Цімашэнка — намеснік начальніка аддзела працы і заработнай платы Гомельскага завода пускавых рухавікоў, У. Арцямкоў — старшы інжынер на Мінскім заводзе шасцерань, А. Цімашэнка— на Маладзечанскім заводзе паўправаднікoвых вентыляў, Р. Папова — у Галоўным упраўленні вылічальных работ ЦСУ БССР. Нашы лепшыя выпускнікі паспяхова вучацца ў аспірантуры, якая ёсць пры ўсіх трох кафедрах факультэта.

Добрую работу былых студэнтаў факультэта на вытворчасці забяспечваюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі і матэрыяльная база факультэта, якая пастаянна развіваецца. Мы задаволены тым, што колькасць медалістаў, якія падаюць дакументы на наш факультэт, перавышае 25 працэнтаў усяго прыёму (асабліва на спецыяльнасць АМАЭІ). У ліку прымаемых на факультэт студэнтаў больш 90 працэнтаў маюць сярэдні бал атэстата сталасці 4,5 і 5,0. І хаця конкурс на нашым факультэце ў параўнанні з іншымі, як правіла, не вельмі высокі (ў сярэднім 2,5—3,5 чалавека на месца), у ім удзельнічаюць добра падрыхтаваныя ў сярэдняй школе абітурыенты. Стаўшы студэнтамі, яны добрасумленна адносяцца да вучобы, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці факультэта і ўніверсітэта.

Нашы студэнты паспяхова сумяшчаюць вучобу з навуковай работай, з заняткамі спортам, мастацкай самадзейнасцю і г. д. Го-

*Слова — выпускнікам*

## НА ПРАКТЫЦЫ

**Праз тры месяцы пяцікурснікі эканамічнага факультэта атрымаюць дыпломы і раз'едуцца ў розныя куткі нашай краіны, каб пачаць самастойнае працоўнае жыццё. Яму ж папярэднічалі пяць гадоў карпатлівай працы, настойлівага авалодвання будучай спецыяльнасцю на лекцыях, практычных і семінарскіх занятках, у навуковых гуртках і, безумоўна, вытворчыя практыкі на прамысловых прадпрыемствах вобласці, рэспублікі, краіны. Але самай адказнай для будучых маладых спецыялістаў з'явілася апошняя, пераддыпломная практыка. Аб ёй сваімі ўражаннямі дзеляцца сёння студэнткі-выпускніцы аддзялення арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі Н. Ягорава, К. Сямкова, А. Угрумава.**

Добрай базай для вытворчай практыкі студэнтаў-эканамістаў з'яўляюцца вылічальныя цэнтры на вядучых прадпрыемствах станкабудаўнічай, інструментальнай і гадзіннікавай прамысловасці СССР. Нам, студэнтам аддзялення АМАЭІ, вельмі пашанцавала: праходзілі пераддыпломную практыку ў Маскве на прадпрыемствах, дзе створаны аўтаматызаваныя сістэмы кіравання вытворчасцю. Адна з такіх сістэм дэманстравалася на міжнароднай выстаўцы «Аўтаматызацыя-69» і ў 1970 годзе — на ВДНГ СССР. Там яна атрымала дыплом 1-й ступені. Другія ж сістэмы, з якімі мы азнаёміліся больш падрабязна, ахопліваюць розныя сферы вытворчай дзейнасці (асноўную вытворчасць, збыт і г. д.) і кіраванне. Нам, як будучым спецыялістам у гэтай галіне, практыка дала шмат карыснага.

За час знаходжання ў сталіцы нашай Радзімы мы не толькі набывалі вытворчыя навыкі. Не наведаць Трацякоўскую галерэю, Музей выяўленчага мастацтва імя А. С. Пушкіна, Вялікі тэатр СССР было проста немагчыма. Узбагаціць сябе духоўна нам дапамаглі выстаўкі французскай гравюры, афішы і плаката, палотнаў рэалістаў Ірака. Незабыўныя ўражанні засталіся ў нас ад наведвання Вялікага тэатра СССР, дзе мы глядзелі оперы Даргамыжскага «Каменны госць», «Русалка», Чайкоўскага «Яўген Анегін» з удзелам выдатных майстроў опернай сцэны В. Атлантава, Ю. Гуляева, А. Вядзернікава, Т. Сіняўскай і Т. Мілашкінай.

Мастацтвам танца нас пакарылі Т. Бяссмертнава, Н. Паўлава, В. Гардзееў, Н. Філіпава,

